*Д. С. БУЦІН*

# УЗАЕМААДНОСІНЫ КАПЫ З ГРОДСКІМ І ПАНСКІМ СУДАМІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў XVI—XVIII стст.

Шмат элементаў сучаснай прававой і судовай сістэмы зарадзілася менавіта ў часы панавання копнага звычаёвага права. Дадзенае палажэнне адлюстроўвае практычны ўплыў капы на тагачаснае грамадства, а разам з тым падкрэслівае прыкладную значнасць гэтай працы — магчымае выкарыстанне некаторых дадатных рысаў копных традыцый і ў сённяшняй юрыдычнай практыцы. Праблема ўзаемаадносін капы з гродскім і панскім судамі амаль не распрацавана як у беларускай, так і ў сусветнай гістарычнай навуцы.

**Кампетэнцыя гродскага і панскага судоў у параўнанні з копнай.** Гродскаму суду падлягалі справы крымінальнага характару: «аб наездзе гвалтоўным <...> аб гвалтаванні жонак <...> аб разбоі на шляхах, аб злачынствах, аб фальшу, аб падпале... аб чарадзействе, аб шляхецкіх разборках» [13, раздз. IV, арт. 3]. Суд панскі разглядаў справы аб розных крыўдах крымінальнага і цывільнага характару паміж панамі і іх падданымі [13, раздз. III, арт. 2; раздз. IV, арт. 48]. Панскі суд лічыўся вотчынным, а не дзяржаўным, як гродскі. У дзейнасці гэтых судовых устаноў існаваў пэўны паралелізм паводле характару спраў, што яны разглядалі, а галоўным адрозненнем з'яўляўся сацыяльны склад удзельнікаў.

Капа ж магла разглядаць усе справы, падсудныя як гродскаму, так і панскаму суду. Што ж было галоўнымі крытэрыямі таго, які суд разглядаў тое або іншае здарэнне? Першы і найбольш значны — непасрэдная воля пакрыўджанага, што нават было замацавана ў пісьмовым заканадаўстве [13, раздз. XIV, арт. 9]. Улічвалася, у якім судзе ён хацеў вырашаць справу. У тыя часы панавала прыватнае права, і роля ісца ў судовым працэсе была нашмат больш значнай, чым зараз. Ён меў права нават вызваліць ад пакарання свайго крыўдзіцеля ўжо пасля афіцыйнага прысуду. Другі крытэрый — гэта моц традыцый [7, с. 45—56]: калі злачынства зроблена невядома кім, больш зручным было звярнуцца да

---

**Буцін Дзяніс Сяргеевіч** — аспірант кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, магістр гістарычных навук.

капы, бо ніхто не мог ведаць сацыяльны стан злачынцы, а дадзеная ўстанова мела ўніверсальны бессаслоўны характар у адрозненне ад саслоўных гродскага і панскага судоў. Трэці — толькі на капе можна было сабраць шмат народу, што спрыяла больш хуткаму раскрыццю злачынства. Такім чынам, зварот да капы знаходзіўся ў сферы непасрэдных інтарэсаў самога скрыўджанага [14, с. 85—86].

Дзяржава і яе судовая сістэма праз Статуты ВКЛ сцвярджала, што ў выпадку знаходжання трупа невядомага чалавека афіцыйны ўрад (або той, на чыёй зямлі знаходзіцца цела) павінен быў сабраць капу [13, раздз. XI, арт. 26]. Гродскі суд час ад часу звяртаўся за дапамогай да капы, калі яму патрэбна было правесці следчыя мерапрыемствы («шкрутыниум») у пэўнай мясцовасці [13, раздз. XI, арт. 26, 61, 63; 1, № 148, 183, 184, 198]. З прычыны таго, што капа лепш ведала тэрыторыю і насельніцтва дадзенага месца, гэта было цалкам натуральнай з’явай. Ф. Леантовіч пад уплывам згаданага факта, даволі спрэчна, падзяляў копы на звычайныя і следчыя, апошнія, на яго думку, менавіта тыя, што дапамагалі гродскаму ўраду, але ўласнага рашэння не выносілі [8, с. 120—121]. Дадзеную пазіцыю падзяляла і А. Яфіменка [6, с. 358].

Гродскі суд магутнасцю сваёй улады і аўтарытэту прымушаў да выканання таго або іншага выраку капы, калі адзін з бакоў не рабіў гэтага добраахвотна [13, раздз. XIV, арт. 9]. Ён з’яўляўся першаснай апеляцыйнай інстанцыяй для копнага сходу [14, с. 89]. Гродскі ўрад рэдка адмяняў пастановы капы і амаль заўсёды прызнаваў слушнасць апошняй.

**Адпраўленне капой справы ў вышэйшы суд.** Сустракаліся выпадкі, калі капляне, давёўшы справу да канца, вызначыўшы вінаватага і нават акрэсліўшы памеры кампенсацыі з боку падсуднага скрыўджанаму за панесеныя страты, не выносілі канчатковага прысуду аб пакаранні, а адпраўлялі справу да большага розуму ва ўрадавы суд [14, с. 548]. У сучаснай судовай практыцы такія выпадкі з’яўляюцца амаль немагчымымі (калі права на разгляд канкрэтнай справы не супярэчыць кампетэнцыі пэўнага суда), а на той час дадзенае выглядала даволі натуральным. У выніку якіх-небудзь з’явіўшыхся складанасцей ніжэйшая судовая інстанцыя перадавала справу вышэйшай, больш аўтарытэтнай і дасведчанай [5, с. 12; 9, с. 653]. Такім чынам, першай прыступкай для адпраўленай копнай справы быў гродскі, а апошняй, як ні дзіўна, сам Гаспадарскі суд — вышэйшая судовая ўстанова ў ВКЛ да ўвядзення ў 1581 г. Галоўнага трыбунала. Факт такога адпраўлення капою некаторых сваіх спраў да вышэйшых урадаў ніякім чынам не з’яўляецца паказчыкам недасканаласці ці толькі дапаможнасці дадзенага судовага інстытута, бо такія з’явы прак-

тыкаваліся і іншымі судамі, напрыклад, ваяводскі суд часцяком адпраўляў свае справы на разгляд да вялікага князя і г. д. [14, с. 549].

Прычынамі перадачы капой справы іншаму суду з'яўляліся часцей за ўсё пытанні судаводчага характару, якія не маглі развязаць копнікі: хто меў большае права на прысягу, пацярпелы або падсудны; адмова каго-небудзь адвесці ад сябе след; нявыхад пэўнай асобы на капу; схаванне кім-небудзь свайго госця; наяўнасць неідэнтыфікаванай улікі і г. д. [15, № 351]. Усё залежала ад абставін канкрэтнага здарэння. Таксама капа мусіла перадаць права канчатковага вырашэння справы і пакарання шкодніка ў выпадках, калі не знаходзілі вінаватага [1, № 395]. Суд мог перанесці разгляд здарэння ў іншую ўстанову па прычыне нязгоды пацярпелага з сумай, якую яму прысудзіла капа, з мэтаю ўзнаўлення панесеных страт і вымагання ім большай [1, № 28]. Тады сума прызначалася ўжо дадзенай установай. Перадача мусіла адбыцца і ў выніку адмовы пана, якому належаў злачынца, выдаць яго капе [1, № 428]. Копны суд заўсёды адсылаў справы да іншых урадаў, калі ён быў скліканы толькі для правядзення выключна паліцэйска-следчых мерапрыемстваў, напрыклад, у панскі суд. Здаралася, што капа ўхілялася ад вырашэння пэўнай справы, не ўдакладніўшы, куды менавіта яна яе перадае [14, с. 552]. Некаторы раз у здарэннях, дзе асноўнымі дзеючымі асобамі з'яўляліся шляхціцы або жыды, капа перадавала права іх разгляду гродскаму ўраду. Амаль заўсёды суд меў рацыю, калі перадаваў справу ў іншую інстанцыю. Але трэба не пагадзіцца з думкай І. Спрогіса аб тым, што капа часта прыбягала да дапамогі гродскага суда і амаль кожны раз рабіла яму свае справаздачы [10, с. 35].

Статутавыя палажэнні хоць прама і не змяшчаюць у сабе апісання перадачы справы з аднаго суда ў іншы, але ў асноўных сваіх момантах не супярэчаць звычаям копнага права наконт практыкі адпраўлення спраў да вышэйшага розуму. У выпадках накіравання ўрадавых суддзяў на капу па зямельных справах Статут ВКЛ 1529 г. прадугледжваў магчымасць іх звароту за дапамогай да дзяржаўнага суда, а III Статут наказваў прыцягваць да адказнасці ў гродскі суд тых паноў, якія не пагаджаліся выконваць копныя рашэнні [11, раздз. VIII, арт. 6; 12, раздз. IV, арт. 30; 13, раздз. IV, арт. 54; раздз. XIV, арт. 9].

**Копны «адказ» перад панамі падсудных і ўрадам.** Пасля вынясення прысуду па справе капа пераходзіла да іншага мерапрыемства ў сваім судаводстве — трымала адказ (справаздачу) па сваім рашэнні перад урадавым (часцей за ўсё гродскім, радзей земскім) ці панскім судом. У выніку таго, што пераважная колькасць вінаватых з'яўляліся панскімі пад-

данымі, копнікі ў першую чаргу неслі адказнасць за свае выракі перад гаспадарамі асуджаных. Дадзены копны адказ складаўся з некалькіх частак: капляне неслі перасуд (судовае мыта) пану абвінавачанага і паведамлялі яму аб змесце прысуду [1, № 326]. Феадал, у сваю чаргу, калі пагаджаўся з рашэннем суда, павінен быў узяць сабе палову перасуду як узнагароду за турбаванні і страты і вызначыць дакладны тэрмін выканання пакарання [7, с. 39—44]. Адсутнасць перасуду пры копным адказе з'яўлялася парушэннем звычаёвага права, а такі адказ мог лічыцца несапраўдным. Сустракаліся моманты, калі паны ці іх ураднікі ўсялякімі магчымасцямі імкнуліся ўхіліцца ад выслухоўвання капы і ўзяцця перасуду. Прычынамі гэтага мог быць цэлы шэраг выпадкаў: 1) адпраўленне гаспадаром падданага копнікаў да непасрэднага апекуна вінаватага па дадзенай справе; 2) узяўшы перасуд, жонка ці ўраднік пэўнага пана маглі адкласці здзяйсненне самога копнага рашэння да прыезду свайго мужа або гаспадара; 3) феадал адмаўляўся выслухаць копны адказ, тлумачыўшы дадзеныя паводзіны тым, што копнікі не мелі права судзіць яго прыгоннага; 4) нарэшце, гаспадары ўвогуле адказваліся ўзяць перасуд без якіх-небудзь тлумачэнняў [1, № 9, 44, 61, 62, 233].

Аднак усе прыведзеныя прыклады панскай адмовы ад выслухоўвання копнага адказу, а з гэтым і выканання рашэння не прыводзілі каплян у тупік. Яны ў такім разе адказвалі і неслі перасуд да ўрадавага суда, але ж гэта, канешне, зацягвала канчатковае вырашэнне справы. Грошы такога перасуду ішлі ў дзяржаўны скарб або, як сведчаць акты, да самога вялікага князя. Дзяржаўныя суды часцяком станавіліся на бок капы і лічылі незаконным не толькі адмову гаспадара ўзяць палову перасуду за свайго падданага, але і словы аб адсутнасці ў копнікаў патрэбнай кампетэнцыі, каб судзіць яго прыгоннага, ці ўвогуле ўхіленне ад выслухоўвання іх адказу. Здаралася, што гродскі суд прымусова абавязваў феадала вінаватага выканаць копнае рашэнне. Цалкам натуральным выглядае факт частай адмовы шляхціцаў выслухаць і выканаць вырак суда, бо ўсе страты, якія ўчыніў яго падданы пацярпеламу боку, збольшага ўзнаўляліся менавіта панскімі грашыма або маёмасцю па прычыне верагоднай неплацежаздольнасці злачынцы. Таксама ж і фізічнае пакаранне (у тым ліку смяротнае) пэўнага прыгоннага прыносіла адчувальныя страты ягонаму феадалу, бо апошні губляў у асобе селяніна працоўныя рукі. Аднак пытанні аб фізічных карах амаль ніколі не ўздымаліся падчас копнага адказу, таму што яны вырашаліся яшчэ раней, а менавіта ў момант працэдуры выдачы панам свайго падданага ў выглядзе падсуднага ў поўнае распараджэнне капы.

Поруч з адказам капы перад панам вінаватага сустракалася такая ж з’ява, але ўжо ў адрас мясцовага гродскага ўрада [14, с. 559]. Пра зварот копнікаў да гродскага суда ў выніку непадпарадкавання пэўнага шляхціца іх волі гаварылася вышэй. Аднак здаралася, што капа адразу ж накіроўвалася да дзяржаўнага ўрада без заявы аб негатыўным стаўленні нейкага пана да яе рашэння. У некаторых актах дадзеныя выпадкі ўвогуле ніяк не тлумачацца копнікамі. Адказ перад гродскім судом мог адбыцца, калі абвінавачаны з’яўляўся вольным чалавекам і не належаў нейкай асобе. Але цікава, што такое магло адбыцца і пры залежным стане злачынцы. Гэта можа тлумачыцца тым, што зацікаўленая ў справе асоба імкнулася пакінуць ва ўсеагульнай памяці сэнс здарэння і пэўнага копнага выраку, а менавіта зрабіць запіс у гродскіх судовых кнігах. Свой адказ перад урадам капа несла, калі распавядала аб змесце справы і выраку, вымагала ад яго вызначыць дакладны тэрмін выканання вынесенага ёй рашэння, а таксама перадавала гроду перасуд. Копнікі мусілі несці адказ перад гродскім урадам з мэтаю фіксацыі незаконных учынкаў, што адбыліся падчас сходу. Гродскі суд не толькі пасіўна слухаў адказ капы і прымаў ад яе перасуд, але сваім аўтарытэтам зацвярджаў прысуд каплян, і часцей за ўсё без змен. Ён прымаў адказ ад капы — выслухоўваў змест справы і выраку, браў перасуд, вызначаў час здзяйснення рашэння. Гэта грод рабіў замест пана злачынцы, калі гаспадар супраціўляўся патрабаванням копнікаў [14, с. 561].

Хутчэй за ўсё, нейкага праўнага значэння зацвярджэння ці ўхвалы пэўнага копнага адказу і рашэння не існавала, гэта з’яўлялася звычаем у выглядзе простага станоўчага адказу з боку пана ці ўрада на словы каплян. Сустракаюцца толькі адзінкавыя выпадкі скасавання адказаў капы панскім або дзяржаўным судамі [1, № 36, 378].

Склад копнай дэлегацыі падчас свайго адказу мог быць даволі разнастайны. Па-першае, гэта тлумачыцца тым, што месца, дзе яны неслі сваю справаздачу, знаходзілася блізка да капавішча. Часцей за ўсё гэта тычылася адказу перад панам абвінавачанага, бо гродскі ўрад у большасці выпадкаў знаходзіўся на значнай аддаленасці ад месца збору сходу.

Па-другое, гэта залежала ад групы спецыяльна абраных капою пасланцоў. У актах часцей фігуруе лічба тры [15, № 167], але колькасць такіх асоб вагалася ад адной да некалькіх дзясяткаў. Такі склад копнікаў мог сустракацца як пры адказе перад урадам, так і ў панскім судзе.

Па-трэцяе, аказваў уплыў і склад афіцыйных асоб, што былі запрошаны на капу зацікаўленым бокам. Імі спачатку былі намеснікі дзяржаўцаў, дзецкія і віжы, а пасля рэформы 1564 г. возныя (судовыя след-

чыя) са сваёю «стороною» — 2—3 годныя сведкі шляхецкага паходжання [15, № 97].

Па-чацвёртае, у дэлегацыю мог уваходзіць зацікаўлены ў справе бок. Разам з ім тут у некаторых выпадках знаходзіліся спецыяльна абраныя капляне або возны. Здаралася, што зацікаўленая асоба (часцей за ўсё ісцец, але ёй мог з’яўляцца і падсудны, калі яго апраўдалі) несла копны адказ перад гродскім судом увогуле ў адзіноце ці толькі з наяўнасцю ў сваіх руках пісьмовай рэляцыі (справаздачы) вознага [1, № 42, 52, 55]. Іншы раз, напрыклад ісцец, мог паслаць ва ўрад для здзяйснення адказу копнага свайго прадстаўніка, заступніка.

Найбольш распаўсюджанай формай копнага адказу, як перад панам, так і ўрадам, з’яўлялася вусная. Але сустракаліся выпадкі і пісьмовага копнага адказу. Ён складаўся непасрэднымі ўдзельнікамі сходу, што некаторым чынам супярэчыць сцвярджэнню А. Яфіменкі аб пагалоўнай непісьменнасці каплян, бо ў склад зборкі на правах дзейсных членаў маглі ўваходзіць шляхціцы, возны і г. д. [6, с. 355]. Урадавы суд увогуле патрабаваў ад капы толькі пісьмовых заяў, якія лёгка маглі паходзіць непасрэдна з-пад пяра саміх копнікаў. Подпісы пэўных асоб мусілі ставіцца на дэкрэтах (судовых рашэннях) і пры поўнай непісьменнасці ўдзельнікаў сходу. Гэта адбывалася праз запрашэнне на капу для складання дакумента і роспісу на ім за сябе якой-небудзь пісьменнай асобы ці праз прыкладанне да дакумента ўласнага крыжыка, клейна (своеасаблівая пячатка), бортнага або межавага знакаў. Хоць не заўсёды акты прыводзяць інфармацыю аб тым, хто дакладна складаў дэкрэт, але з упэўненасцю можна сказаць, што яго пісалі на месцы пасяджэння падчас самога судовага працэсу [1, № 62, 340, 345, 392, 423].

Сведчанні вознага існавалі ў дзвюх формах: вуснай і пісьмовай. У параўнанні з копнымі заявамі справаздачы возных надзвычай рэдка былі вуснымі. Толькі два апошніх Статута ВКЛ ведаюць працэдуру копнага адказу ў выглядзе справаздачы вознага аб сэнсе справы і змесце судовага рашэння [12, раздз. XIV, арт. 6; 13, раздз. XIV, арт. 9].

**Апеляцыя супраць копнага рашэння ў вышэйшы суд.** Нязгода пэўнага боку з прысудам цягнула за сабою апеляцыю да вышэйшага суда. Ёсць адзінкавыя моманты, калі непасрэдна капа дасылае апеляцыю ў гродскі ўрад па выраку, які сама і прыняла. Хутчэй за ўсё гэта адбывалася па прычыне нязгоды з прынятым рашэннем кагосьці з удзельнікаў працэсу або з-за недакладнасці складзенага дэкрэта. Такім чынам, копная апеляцыя часта з’яўлялася працягам першаснай адозвы незадаволенага, калі копнікі пагаджаліся з апошняй [14, с. 588].

Апеляцыі супраць рашэнняў капы найбольш часта адсылаліся на разгляд гродскаму суду да вышэйшага права. Трэба адзначыць, што часцей за ўсё гродскі ўрад не задавальняў апеляцыі супраць копных рашэнняў. Акрамя гроду, незадаволены мог скардзіцца ў суд свайго пана. Нарэшце, трэцяй інстанцыяй, куды заносілася такая апеляцыя, з'яўляўся сам копны суд. Яго склікалі ў выпадках неабходнасці перагляду справы, якая ўжо разглядалася на ранейшай капе. Выбар той судовай установы, куды асоба дасылала сваю апеляцыю супраць копнага рашэння, залежаў выключна ад яе волі.

З 1622 па 1623 г. цягнулася вельмі цікавая судовая справа, якая прайшла наступныя інстанцыі: копны суд — гродскі суд — Галоўны трыбунал ВКЛ — вялікі князь. Падчас гэтых спрэчак паміж бакамі і гродскі, і трыбунальскі, і вялікакняжацкі суды пацвердзілі першапачатковае копнае рашэнне. Дадзены факт падкрэслівае, што прысуды капы павінны былі выконвацца нароўні з рашэннямі іншых судоў ВКЛ. У гэты час копны суд функцыяніраваў у судовай сістэме дзяржавы як самабытны, але кантралюемы дзяржаўным заканадаўствам інстытут [4, с. 104—106].

Падставы для скаргаў супраць копных рашэнняў маглі быць даволі розныя. Сярод сутнасных па справе з іх былі наступныя: беспадстаўнасць выраку капы і фальшывыя сведчанні, у чым быў упэўнены апелюючы бок [14, с. 594]. Былі і фармальныя падставы аспрэчвання прысудаў капы: прыняцце завочнай ухвалы без выслухоўвання падсуднага; спрэчкі пра магчымы дазвол ці забарону да сведчання, прысягі, катаванняў; нязгода з тэрмінам збору наступнага сходу [3, № 88]; заява незадаволенай асобы аб разглядзе капой справы, якая не ўваходзіць у яе кампетэнцыю; адмова ўзяць перасуд; неабвяшчэнне аб зборы суда і г. д. [14, с. 596—597].

Пераходзячы да апеляцыйнага судаводства, трэба адзначыць, што ў Сярэднявеччы апеляцыя ўяўляла сабою пісьмовую скаргу незадаволенага ў адрас пэўнага суда для перагляду справы. Потым гэтая занесеная пратэстацыя, у нашым выпадку, пераўтвараецца ў гродскім урадзе ўжо ў позву ад яго імя ў бок абвінавачаных апелюючым. Прыкладна тое ж самае магло адбывацца і пры апеляцыі ў панскі суд. На скліканай зацікаўленай асобай апеляцыйнай капе скарга абвяшчалася, як і звычайна, напачатку самога пасяджэння. Далейшы крок судовага следства апеляцыйнай інстанцыі — дакладнае вызначэнне ранейшай копнай ухвалы [9, с. 658—659]. Гэта адбывалася або з дапамогаю наяўнасці пісьмовага рашэння, ці пры дапамозе сведчанняў копнікаў, што прысутнічалі пры разглядзе першай справы. Калі дакладнасць выраку выклікала сумнеў, апе-

ляцыйная ўстанова праводзіла следства адразу ж на месцы, каб удакладніць сапраўдны змест і сэнс ранейшага прысуду. Наступным момантам з'яўлялася неабходнасць праверкі слушнасці копнага рашэння па сутнасці справы. Ішло даследаванне довадаў копнага суда, якімі ён карыстаўся пры вынясенні сваёй ухвалы, выслухоўваліся сведкі незадаволенага. Апеляцыйны орган мог патрабаваць і ад самой зацікаўленай асобы пэўных доказаў яе пазіцыі, напрыклад прысягі. Такім чынам, дадзеная інстанцыя праводзіць звычайныя судовыя дзеі: дапытвае абвінавачанага, патрабуе прысягі і г. д.

Апеляцыйная ўстанова магла прымусіць змяніць ці ўвогуле скасаваць раней прынятую копную ўхвалу [1, № 28]. Змяненне судовага рашэння часцей за ўсё тычылася пытання павелічэння або змяншэння сумы ўзнаўлення страт пацярпеламу асобай вінаватага. Адмена выраку капы магла мець тры аспекты: поўнае апраўданне асуджанага сходам; прызначэнне больш блізкім да здзяйснення пэўнага судовага доваду (напрыклад, прысягі) супрацьлеглага боку, чым той, якога абраў суд; даручэнне капе нанава перагледзець справу. Апраўдальнае рашэнне апеляцыйнай інстанцыі адбывалася або ў выніку фармальных прычын, або было выклікана сутнаснымі падставамі. Да фармальных умоў належалі: адсутнасць у руках апеляцыйнага органа выраку копнага суда; перавышэнне каплянамі сваіх паўнамоцтваў і кампетэнцыі; няпэўнасць першага рашэння. Сярод падстаў па сутнасці справы асноўнай з'яўляецца давядзенне асуджаным сваёй невінаватасці і доказ прыналежнасці да злачынства іншай асобы. Вяртанне апеляцыйнай установай справы зноў на разгляд капы адбывалася, калі першае рашэнне не мела свайго лагічнага канца ці выклікала сумненне па сваім змесце.

Копныя рашэнні карысталіся вялікай павагай, і таму іх аспрэчванне з'яўлялася дастаткова рэдкай з'явай не толькі з боку простага люду, але і людзей шляхецкага саслоўя [2, с. 47]. Тры Статуты ВКЛ ні ў адным са сваіх шматлікіх артыкулаў не ўтрымліваюць аніякай інфармацыі аб магчымасці апеляцыі на копныя ўхвалы ў вышэйшыя суды. Гэта дае падставу сцвярджаць, што дадзеная традыцыя з'яўляецца выпрацоўкай выключна звычаёвага копнага права, якую ў сваю практыку з цягам часу ўвялі і дзяржаўныя суды.

Нейкіх буйных канфліктаў паміж капой і гродскім судом у крыніцах амаль не зафіксавана. Іх узаемаадносіны сведчаць аб карысным двухбаковым кампрамісе і гарманічнасці між звычаёвым і пісьмовым правам.

Адносіны панскага суда з капой былі больш складаныя. Калі сход судзіў гаспадарскага падданага, то капа павінна была дзейнічаць згодна

з вотчынным правам. Адсюль маглі вынікаць розныя непаразуменні. Толькі пры ўмове, калі гаспадар пагаджаўся на падсуднасць свайго прыгоннага народнаму суду, апошні меў права выносіць уласнае рашэнне [3, № 105]. Існаваў так званы інстытут «выдачи виннага» — падданы перадаваўся сваім патронам пад копную юрысдыкцыю. Былі выпадкі, калі капа і панскі суд аб'ядноўваліся ў сваёй працы, і нельга было дакладна аддзяліць адно ад аднаго. Справа, якая пачыналася на абшчынным сходзе, магла завяршыцца ўжо ў панскім судзе [1, № 162]. Гэта адбывалася, калі падсудны звяртаўся за абаронай да свайго гаспадара. Некаторы раз капа толькі выносіла судовую пастанову, а яе непасрэднае здзяйсненне перадавала гаспадару адказчыка.

Шэраг узаемадачыненняў паміж капой, з аднаго боку, і гродскім і панскім судамі — з другога, адбываўся ў працэсе здзяйснення судовых аплат — перасуду і памятнага. Дастаткова блізка звязвалі копны сход з урадавым судом і афіцыйныя асобы, што маглі прысутнічаць на пасяджэннях капы. Падчас парукі на капе апошняя мусіла кантактаваць з асобай пана абвінавачанага.

Копны суд заўсёды імкнуўся падтрымліваць адэкватныя дзяржаўныя наваўвядзенні, што яскрава праявілася ў актыўным і плённым узаемадзеянні капы з урадавым і панскім судамі. Супрацоўніцтва каплян, гродскага і панскага судоў было карысна ўсім тром суб'ектам судовай улады, а таксама, што важней за ўсё, асобам, якія звярталіся да іх за прававой дапамогай.

## ЛІТАРАТУРА


1. Акты, издаваемые Виленскою Археографическою комиссиею / предисл. И. Я. Спрогиса. Акты о копных судах. Вильна, 1891. Т. XVIII. 577 с.

2. *Антонович, В. Б.* Предисловие / В. Б. Антонович // Содержание актов об околичной шляхте. Архив Юго-Западной России. Киев, 1867. Т. I, ч. 4. С. 43—48.

3. Архив Юго-Западной России, издаваемый временною комиссиею для разбора древних актов высочайше учрежденною при Киевском, Подольском и Волынском генерал-губернаторе. Акты об экономических и юридических отношениях крестьян в XV—XVIII веках (1498—1795). Киев, 1876. Т. 1, ч. 6. 614 с.

4. *Голубеў, В. Ф.* Абшчынны (копны) суд у дзяржаўнай судовай сістэме ВКЛ у другой палове XVI — першай палове XVII ст. / В. Ф. Голубеў // Леў Сапега (1557—1633) і яго час: зб. навук. арт. / ГрДУ імя Янкі Купалы; рэдкал.: С. В. Марозава [і інш.]. Гродна, 2007. С. 100—106.

5. *Демченко, Г. В.* Притомные люди и копная сторона // Варшавские университетские известия. 1899. № 5. С. 1—42.

6. *Ефименко, А. Я.* Южная Русь. Очерки, исследования и заметки / А. Я. Ефименко. Санкт-Петербург, 1905. Т. I. 439 с.

7. *Иванишев, Н. Д.* О древних сельских общинах в Юго-Западной России / Н. Д. Иванишев. Киев : Киевск. археогр. комис., 1863. 72 с.

8. *Леонтович, Ф.* Областные суды в Литве / Ф. Леонтович // Журнал министерства юстиции. 1910. № 9—10. С. 88—128.

9. *Любавский, М. К.* Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского статута: ист. очерки / М. К. Любавский. М., 1893. 998 с.

10. *Спрогис, И. Я.* Предисловие / И. Я. Спрогис // Акты, издаваемые Виленскою Археографическою комиссиею. Т. XVIII. Акты о копных судах. Вильна, 1891. С. 19—61.

11. Статут Великого княжества Литовского 1529 года / под ред. К.И. Яблонскиса. Минск, 1960. 254 с.

12. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / пад рэд. Т. І. Доўнар, У. М. Сатоліна, Я. А. Юхо; рэдкал.: Т. І. Доўнар [і інш.]. Мінск : Тэсей, 2003. 250 с.

13. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года: Тэксты. Даведнік. Каментарыі / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.]. Мінск : БелСЭ, 1989. 573 с.

14. *Черкаській, І.* Громадській (копній) суд на Україні — Русі XVI—XVIII вв. / І. Черкаській // Праці комісіі для виучування історіі західно-руського та вкраінського права / за ред. Н. П. Васіленкі. Київ, 1928. Вип. 4—5. 714 с.

15. *Ясинский, М. Н.* Материалы для истории судоустройства и судопроизводства в Литовско-Русском государстве. Акты о копных и панских судах / М. Н. Ясинский. Киев, 1897. Т. I: 1501—1588. 846 с.

## РЭЗЮМЭ. SUMMARY

На основе изучения источников и историографии вопроса всесторонне анализируются взаимоотношения копы с гродским и панским судами на белорусских землях ВКЛ в XVI—XVIII вв. Рассматриваются следующие проблемы: компетенция гродского и панского судов в сравнении с копой, передача копой дел в высшие суды, копный отчет перед ними, апелляция на решения копы. Делается вывод об эффективной, слаженной и взаимовыгодной деятельности копного, гродского и панского судов между собой, а тем самым и для всего общества.

The study analyzes the relations of kapa with castle court and landlord's court in the Belarusian lands of the Grand Duchy Lithuanian in the 16—18$^{th}$ centuries. The following problems are being explored: the competence of castle and landlord's court as compared to that of the kapa court, case referral from kapa to a higher court, case report of kapa court to a higher court, kapa court appeals. The conclusion is made of effective, advantageous organization of the courts system for the benefit of the whole society.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 12 верасня 2011 г.